УДК 821.161.3”18”

**В. А. Сянчыла**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВОБРАЗ ЛЕСНІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

**Уводзіны.** Лясы — 7галоўнае прыроднае багацце Беларусі. Яны захаваліся на нашай зямлі дзякуючы таму, што нашы продкі не хацелі і не любілі вынішчаць іх, а адносіліся да іх як да святыні. Яшчэ ў XIX ст. этнограф, археолаг, публіцыст Адам Кіркор ў энцыклапедычным выданні «Живописная Россия» адзначаў, што «лес іграе непараўнальна большую ролю ў духоўным жыцці літоўскага народа, чым у жыцці яго матэрыяльным і эканамічным» [1, с. 226]. Таму ў гэтага багацця павінен быць і ахоўнік. Гэта ляснік або паляўнічы.

**Асноўная частка.** Вобраз лесніка з’яўляецца цэнтральным у паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» Янкі Лучыны, якая была напісана на польскай мове, а таксама ў эпічным беларускамоўным вершы «Стары ляснік». Вобраз палясоўшчыка становіцца галоўным і ў паэме «Тарас на Парнасе», аўтарства якой прыпісваюць Канстанціну Вераніцыну.

Прафесія лесніка даволі старажытная, а зараз яна таксама папулярная. Ляснік абараняе лес у замацаваным абыходзе, кантралюе выкананне правілаў водпуску драўніны, касьбы, пасьбы жывёл, захаванасць пажарна-назіральных пунктаў, тэлефонных ліній, апазнавальных знакаў для авіяцыі, мастоў, межавых знакаў, квартальнай сеткі, прытрымліванне тэрмінаў і правілаў палявання; сігналізуе аб праяўленні ў лесе шкодных насякомых і хвароб лесу; затрымлівае людзей, вінаватых у лесапарушэннях і парушэннях правілаў палявання з накладаннем арышту на незаконна дабытую ў лесе прадукцыю; праводзіць растлумачальную работу сярод насельніцтва па ахове і абароне лясоў; удзельнічае ў рабоце па гашэнні лясных пажараў і кіруе гэтай працай, пакуль не прыбудзе чалавек, які займае вышэйшую пасаду. Мастак павінен ведаць: тапаграфічныя, ландшафтныя ўмовы і асаблівасці абходу; правілы пажарнай бяспекі ў лясах, палявання ў вобласці, краі, рэспубліцы, водпуску драўніны на корані, касьбы, пасьбы жывёл; тэхнічныя ўмовы і ГОСТы на нарыхтоўку лесанасеннага матэрыялу, харчовых прадуктаў лесу, лекавых раслін; тэрміны правядзення і тэхналогію біятэхнічных і ўзнаўляльных мерапрыемстваў [2, с. 182—183].

Прафесія лесніка ў значнай ступені міфалагізаваная ў традыцыйным светапоглядзе. Як чалавек, прафесійна звязаны з лесам, ён надзяляўся здольнасцю да звышнатуральнай сувязі з яго насельнікамі, як рэальнымі — жывёламі, так і міфалагічнымі істотамі. Перш-наперш ляснік мусіў наладзіць добрасуседскія і парытэтныя адносіны з лесавіком. Дзеля гэтага на Благавешчанне ляснік нёс у лес пасолены хлеб з абрэзкамі сваіх валасоў, пазногцяў. На ўскрайку лесу ён станавіўся тварам на ўсход, круціў хлеб над сабой і казаў замову са словамі «Чі ты дай галаву авеццу, // Чі чаловеццу» і потым «Досыць маіх валасоў» ці «Апрыч маей галавы» і кідаў хлеб далёка ўбок. Гэты рытуал з’яўляецца магічнай імітацыяй ахвяры. Спалучэнне частак чалавечага цела з культурнымі рэчамі — хлебам і соллю — істотнымі культавымі, рытуальнымі стравамі — надае ахвяры значную семантычную моц, сведчыць аб высокім міфалагічным статусе лесніка як істоты, якая звязана са светам культуры і прыроды.

З леснікам звязана і магія палявання: лічылася, што леснікі надзвычай трапна страляюць ці могуць псаваць чужыя стрэльбы. Вобраз лесніка цесна карэлюе з вобразам паляўнічага [3, с. 285].

Паэмы «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» Янкі Лучыны і «Тарас на Парнасе» з’яўляюцца падобнымі ў паэтычна-вобразным плане, бо іх збліжаюць галоўныя персанажы — леснік Грышка ў «Паляўнічых акварэльках…» і Тарас-палясоўшчык з паэмы «Тарас на Парнасе».

Грышка з вялікай павагай і любоўю ставіцца да прыроды і родных мясцін, выступае супраць вырубкі лесу для пракладу чыгункі, гэтаму сведчаць наступныя радкі: «Чыгунку пракладацьмуць тут і даастатку // Павысякаюць Ляды Чорныя, сюды // Збярэцца набрыдзь, купай з’едуцца жыды, // Каб зыскі выдзіраць усюды зграяй цэлай // Да Князя, возера, ад Машукоў і Цепры, // Спусцее Паграбішча, пойдзе ўсё на звод, // І ў Муты схоча ліпкі на прыбыткі зброд, // Сок высмакчуць увесь, нібы кляшчыны, з зямелькі, // Прастоту ўрэшце высмее прыблуда нейкі, // Да ніткі абскубуць…» [4, с. 36].

Тарас таксама вельмі любіць прыроду, якая дае яму натхненне і якой ён дужа захапляецца: «Ахвоце мне! Як там прыгожа! // Як быццам хто намаляваў! // Чырвоны краскі, мак і рожа, //Ну, як сукенку хто паслаў! // І птушкі ёсць там, дужа стройна // Пяюць, палепш за салаўя!» [5, с. 349].

Пан вельмі добра адносіўся да Грышкі, а Грышка, у сваю чаргу, з павагай адносіцца да пана: «Паночку, хай спашлецца ласка вам ад Бога // За сэрца добрае! Не скрыўдзілі старога» [4, с. 79]. Грышка паказваецца як дзіця прыроды: «Аблічча, постаць, а таксама світкі крой // Яскрава сведчылі, што ён дзіця прыроды, // Палесся сын і спадкаемец варты, годны, // Выхоўвалі яго імшарыны , чарот, // Віры і плыні, душагубкі, што з калод» [4, с. 36]. Тарас таксама паўстае ў падобным выглядзе: «Што ж, чалавек ён быў рахманы, // Гарэлкі ў губы ён ня браў, // Затое ў ласцы быў у пана — // Яго пан дужа шанаваў» [5, с. 348].

© Сянчыла В. А., 2019

Репозиторий БарГУ

Грышка з'яўляецца добрым паляўнічым, які ведае і прытрымліваецца паляўнічых традыцый, адказна адносіцца да сваёй справы: «Куцця, паночку, заўтра, трэба ў поле рушыць, // Вялося так спрадвеку; Якая завіруха нават ні была б, // А трэба йсці» [4, с. 42]. Тарас і ў гэтым падобны да Грышкі: «Чуць золак — стрэльбу ён за плечы, // Заткне сякерку за пояс, — // Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы // Ды птушак біць з ружжа Тарас» [5, с. 348]. Палясоўшчык не абдзелены пачуццём уласнай годнасці, а дзесьці сціпласці, і нават нейкага прыдворнага этыкету: калі багі Парнаса сядаюць за стол есці, то Тарас без запрашэння да іх не далучаецца, хоць у самога і бурчыць у жываце. Герой паэмы вельмі назіральны, відаць, гэта прафесійны навык палясоўшчыка. Ён падрабязна апісвае, як выглядае гаспадарка багоў, у якім настроі багіня вечнай маладосці Геба, прыгажосць Венеры.

**Заключэнне.** Вобразы палясоўшчыка Тараса і лесніка Грышкі — гэта адны з першых рэалістычных вобразаў чалавека з народа ў беларускай літаратуры, створаныя аўтарамі з вялікай сімпатыяй, цеплынёй і майстэрствам. Верагодна, што яны ўвасобілі ў сабе тыповыя рысы тагачаснага сялянства: адказнасць перад справай, пачуццё ўласнай годнасці, гумар і сатыру ў адносінах да жыццёвай сітуацыі, а таксама здольнасць бачыць прыгажосць у штодзённы і блізкім.


**Спіс цытаваных крыніц**

1. Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Литовское и Белорусское Полесье. —2-е изд. — Минск : Беларус. Энцыкл., 1994. — 496 с.
2. 2 000 профессий, специальностей, должностей : энцикл. справ. — Минск : Белорус. совет. энцикл., 1986. — 461 с.
3. Міфалогія беларусаў : энцыкл. сл. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка. — Мінск : Беларусь, 2011. — 607 с.
4. Янка Лучына. Творы: вершы, нарысы, пераклады, лісты / укладанне, прадмова і каментарыі У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2001. — 206 с.
5. Беларуская літаратурная спадчына : анталогія : у 2 кн. / уклад.: С. А. Курбанава [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2011. — Кн. 1. — 1029 с.



УДК 371.21



**И. С. Чуносова**

*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*


## СОДЕРЖАНИЕ ПРОГРАММЫ РАЗВИТИЯ МОТИВАЦИОННОГО ПОТЕНЦИАЛА ВЫРАЗИТЕЛЬНОЙ ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ РЕЧИ

**Введение.** Среди средств, обладающих способностью усиливать мотивацию в процессе учебного взаимодействия, практически постоянно упоминается такой компонент педагогического мастерства, как выразительная педагогическая речь и подчеркивается ее мотивирующее воздействие (Е. П. Ильин, Л. Н. Рожина, И. И. Рыданова, В. А. Скакун, А. М. Столяренко и др.). В связи с этим возможно рассматривать *мотивационный потенциал выразительной педагогической речи* как универсалию педагогической деятельности, понимая его как существующую возможность оказывать речевое воздействие на мотивацию учащихся в образовательном процессе с помощью использования в педагогическом дискурсе средств выразительности. В свою очередь, знания и умения, необходимые для реализации этого мотивационного потенциала в собственной учебно-научной речи, являются неотъемлемой частью дискурсивной компетенции педагога.

Анализ образовательных стандартов, учебных программ и планов, регламентирующих подготовку будущих педагогов в учреждениях высшего образования, показывает, что в настоящее время они не имеют четко выраженной ориентации на развитие мотивационного потенциала выразительной педагогической речи. В то же время существует возможность введения данного учебного материала как вариативного: в виде специального курса «Выразительность педагогической речи» либо компонента курсов «Культура речи», «Введение в педагогическую профессию» при подготовке будущих педагогов.

**Основная часть.** Для апробации результативности различных вариантов включения компонента, направленного на формирование дискурсивной компетенции в области владения мотивационным потенциалом выразительной педагогической речи, нами была разработана учебная программа «Выразительность педагогической речи». Целью данного курса является подготовка студентов педагогических специальностей к дидактически эффективной реализации мотивационного потенциала средств выразительности в образовательном дискурсе. Основные задачи обучения: систематизировать знания о психолингвистической и жанрово-стилистической организации педагогического общения; углубить знания о средствах выразительности, обеспечивающих реализацию мотивационного потенциала в речи педагогов; познакомить со спецификой проявления мотивационного потенциала выразительности в образцовом педагогическом дискурсе; сформи-


© Чуносова И. С., 2019



Репозиторий БарГУ